**Больш за 200 дзяцей з Мінска і Мінскай вобласці акунуліся ў музычную казку "Заечы паход на Новы год" у Мінску ў Нацыянальным выставачным цэнтры "БелЭкспа". Арганізатарамі мерапрыемства, якое праходзіць у час рэспубліканскай акцыі "Нашы дзеці", выступаюць Кіраўніцтва справамі прэзідэнта, Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры, Мінгарвыканкам і Мінаблвыканкам, Маладзёжны тэатр эстрады, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.**

# Музычная казка ў зале афіцыйных прыёмаў

Музычная казка адрасавана юным гледачам ва ўзросце ад 6 да 12 гадоў. Яна захапляючая і вясёлая, у ёй дабро перамагае зло, дружба вышэйшая за каварства. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў падрыхтаваў для дзяцей цікавую гульнявую праграму. А фінальным акордам свята стане фота з Дзедам Марозам, Снягуркай, іншымі казачнымі персанажамі.

"Гэта ўнікальнае для Беларусі навагодняе мерапрыемства, — лічыць першы намеснік міністра культуры Беларусі Ірына Дрыга. — У гэтай зале прыёмаў адміністрацыйнага комплексу звычайна праводзяцца мерапрыемствы з удзелам высокіх службовых асоб краіны, лепшых людзей рэспублікі. З 25 снежня па 7 студзеня зала аддадзена ў распараджэнне дзяцей — тут на зімовых канікулах будуць праходзіць святы для юных жыхароў Беларусі з музычнай казкай і карагодам вакол 10-метровай прыгажуні ёлкі".

Тры дабрачынныя святы для дзяцей-сірот, хлопчыкаў і дзяўчынак з мнагадзетных сем'яў, выдатнікаў, удзельнікаў мастацкіх калектываў з Мінска і сталічнай вобласці прайшлі 25 снежня. "Гэта дзеці, якія маюць патрэбу ў асаблівым клопаце і ўвазе з боку дзяржавы і грамадства, а таксама дзеці, якія прадэманстравалі вялікія дасягненні ў вучобе і творчасці", — адзначыла Ірына Дрыга.

**(Па матэрыялах БелТА.)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ